


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

№ 5 (233) 2 красавіка 1996 года, аўторак




*Вясна... З ёю звязаны лепшыя юнацкія мары, надзеі, спадзяванні. Для студэнткі факультэта замежных моваў Наталлі Калядка - гэта першая універсітэцкая вясна. А калі ў залікоўцы ўсе пяцёркі - то і добры настрой, і імкненне да вучобы. Далейшых табе поспехаў, Наташа!*

*Фота А. ПЯТРОВА.*

## ВЫПРАЦАВАНА ПРАГРАМА ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ СУМЕСНАГА ЕЎРАПЕЙСКАГА ПРАЕКТА

Насычанай і плённай была паездка рэктара нашага універсітэта Л.М.Ківача ў Італію, дзе разам з партнёрамі па сумеснай працы з універсітэта Турына (Італія) і універсітэта Варвіка (Англія) адпрацоўваліся шматлікія пытанні ў рамках рэалізацыі сумеснага Еўрапейскага праекта па праграме TEMPUS TACIS. Адбыўся падрабязны абмен думкамі па пытаннях сучаснага стану сістэмы адукацыі, у прыватнасці, у Рэспубліцы Беларусь і канкрэтна - у нашым універсітэце. Выпрацавана праграма па падрыхтоўцы сумеснага Еўрапейскага праекта, вызначаны функцыі і задачы кожнага ўдзельніка. Дасягнута дамоўленасць аб узаемным візіце партнёраў з Італіі і Англіі да нас у красавіку - маі для абмеркавання пытанняў фінансава-эканамічнага абгрунтавання і выпрацоўкі канчатковага варыянта праекта.

Коратка аб самым праекце, аб задачах, што датычацца менавіта нашага універсітэта. Прыярытэтнай галіной, у рамках якой ажыццяўляецца міжнароднае супрацоўніцтва, з'яўляецца рэарганізацыя універсітэцкага кіравання - падрыхтоўка і перападрыхтоўка кіраўнікоў вышэйшага, сярэдняга і аператыўнага звяна; распрацоўка канцэпцыі асноўных падыходаў да стварэння аўтаматызаванай сістэмы кіравання універсітэтам; распаўсюджанне важнейшых дасягненняў TEMPUS у канкрэтным напрамку сярод акадэмічнай і неакадэмічнай аудыторыі, у Беларусі і краінах СНД; стварэнне фармальных і нефармальных сетак далейшага распаўсюджання і ўкаранення дасягненняў СЕПа сярод арганізацый, якія не ўваходзяць у СЕПны кансорцыум.

Удзельнікі праекта нанеслі таксама візіт у Еўрапейскі агульнаадукацыйны фонд, які з'яўляецца агентам Еўрапейскага саюза па праграме TEMPUS TACIS. Тут ад кіраўніцтва фонда атрымалі падрабязную інфармацыю аб праграмах ЕС у галіне адукацыі і аб правілах прадстаўлення заявак на фінансаванне па праграме TEMPUS TACIS.

У апошні дзень візіта адкрылася магчымасць наведаць філіял універсітэта Турына ў правінцыі, дзе ўдзельнікі сустэчы азнаёміліся з сістэмай шматступенчатай бесперапыннай адукацыі, з вопытам узаемадзеяння універсітэта і вытворчасці.

*С. БЕРАСТ.*

## УРУЧАНЫ АТЭСТАТЫ ДАЦЭНТАЎ

Адбылося гэта на сакавіцкім пасяджэнні Савета універсітэта. Колькасць дацэнтаў адразу павялічылася на чатыры чалавекі.

Атэстаты атрымалі:

па кафедры біяхіміі і біятэхналогіі - **ДЗЕНІСЕНКА** Валянцін Аляксандравіч, **РАЗЯПКІН** Віктар Ільіч;

па кафедры тэорыі і гісторыі сусветнай культуры (па курсу "Паліталогія") **ЦЫГАНКОВА** Ларыса Іванаўна;

па кафедры філасофіі **ШЧАЛБАНІНА** Галіна Мікалаеўна.

## ПАСТАЯННЫЯ КАМІСІІ САВЕТА

Як паведамляла ўжо наша газета, з мэтай распрацоўкі грунтоўных напрамкаў дзейнасці універсітэта, для падрыхтоўкі на заслухоўванне злабадзённых пытанняў і для кантролю выканання прынятых рашэнняў створаны пастаянныя камісіі Савета універсітэта.

Ужо зацверджаны іх старшыні, узгоднены персанальны склад камісіі. Конкурсную камісію даручана ўзначаліць І.П. Мартынаву, атэстацыйную - С.А. Маскевічу, камісію па арганізацыі і ўдасканаленню навучальнага працэсу - А.В. Бадакову, па навукова-даследчай працы - В.В. Сянько, па грамадзянскаму выхаванню студэнтаў і сацыяльных пытаннях - М.В. Жарскаму. Камісію па фінансава-эканамічных пытаннях узначаліў Лі Чон Ку, па прававых пытаннях - М.У. Сільчанка, па фармаванню і развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы - В.А. Струк, па інфармаванню і сувязях з грамадскасцю - Т.А. Бадзюкова.

## ГОСЦІ З АМЕРЫКІ

Па розных справах прыехалі ў Гродна амерыканскія педагогі: Білі Хэндэрсан, які займаецца камп'ютарным навучаннем асабліва адораных дзяцей, прывёз групу школьнікаў са штата Фларыда ў гродзенскую школу-ліцэй № 30, і Фрэн Віліс, якая ўкараняе кааператыўнае навучанне - адну з сучасных амерыканскіх методык выкладання. А сустрэліся яны ў нашым універсітэце. Гутарылі са студэнтамі факультэта замежных моваў, пасля прыйшлі на пасяджэнне англійскага клуба, расказвалі аб сістэме навучання ў ЗША, адказвалі на шматлікія пытанні.

Л.М. Серада, кіраўнік гэтага клуба, мяркуе, што такія сустрэчы дапамагаюць нашым студэнтам лепш авалодаць замежнай моваў, сціраюць моўны бар'ер, пашыраюць наш кругагляд. Амерыканскія госці паабяцалі, што праз нейкі час зноў наведаюць Гродна і абавязкова - наш універсітэт.

*С. ІВАНОВА.*



**Практыка**

# ВУЧЫМСЯ ВУЧЫЦЬ

Шэсць тыдняў працягвалася навучальная практыка ў студэнтаў 4-га курса факультэта псіхалогіі і педагогікі



(аддзяленне пачатковых класаў). За гэты час студэнты павінны былі паказаць свае тэарэтычныя веды і практычныя ўменні, набытыя ва універсітэце. Будучыя педагогі працавалі пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў-метадыстаў З.П. Тамашэвіч, І. М. Анішчык, Н.А.Козел, маладых выкладчыкаў А.В. Савушкінай, С.В. Гадзаова, А.Ч. Бляяўскага.

Студэнты давалі ўрокі па ўсіх прадметах у пачатковых класах, праводзілі цікавыя выхаваўчыя мерапрыемствы. З вялікай ахвотай, творча працавалі большасць студэнтаў, а асабліва плённа - Алена Сікора, Таццяна Смалей, Святлана Кароза, Людміла Пархоменка, Элеанора Крышын, Наталля Папова, Андрэй Размысловіч, Антон Казлоўскі, Вольга Казлова, Святлана Барысевіч, Вікторыя Царанкова, Наталля Рэкець, Таццяна Арлова, Таццяна Габрусік.

Вялікі дзякуй дырэктарам, завучам, настаўнікам школ горада №№ 8, 9, 10, 11, 14, 18, 24, 25, якія добразычліва сустрэлі студэнтаў-практыкантаў, стварылі ўсе ўмовы для працы, дапамагалі авалодваць педагагічным майстэрствам.

***М.ЧАРНЯКЕВІЧ,***
*курсавы кіраўнік практыкі.*





*На здымках: навучальная практыка ў СШ № 18.*
*Фота Ул. САРОКІНА.*

# ТРИ ДНЯ МАТФАКА

*Эти три дня, до предела заполненные,интеллектуально насыщенные, сочетали в себе напряженность будней и радость праздника. И всё-таки больше праздника! Они еще раз подтвердили: математики - это не "сухари" из мира безликих цифр и формул, это - всесторонне развитые, одаренные люди, одновременно - и певцы, и поэты, и художники, и сценаристы, и режиссеры... Как правило, математики наделены тонким чувством не только меры, но и юмора. Кто хоть однажды побывал на традиционных днях матфака, знает это. Три мартовских дня на матфаке - не исключение. Праздник выдался на славу!*

С 21 по 23 марта в университете проходили Дни математического факультета. Последний раз они проводились в ноябре 1994 года. Очевидно, что дни матфака - это уже традиция нашего факультета.

В первый день - 21 марта прошла программа, подготовленная "М-клубом" под названием "Хотите - верьте, хотите - нет". Зрители были в восторге от остороумных ответов преподавателей и узнали некоторые занимательные и веселые истории из их жизни и много других подробностей.

Вечером первого дня состоялось посвящение в студенты первокурсников.

Во второй день зрителей ждала еще более интересная программа: "Тусовка "клевых и прикольных" приглашает..." Что это значит? Это команды преподавателей и студентов, состоящие из самых смелых преподавателей и "клевых и прикольных" студентов, своими шутками, пародиями, сценками развеселили даже самых хмурых и недоверчивых зрителей. Если отвечать на вопрос: "Кто победил: команда преподавателей или студентов?", то можно сказать: "Дружба, смех и юмор". Был проведен опрос студентов и рейтинг этой программы достиг 9,8 балла по десятибальной системе.

Особого внимания из дней матфака этого года заслуживает заключительная супершоу-программа под названием "Эй, ухнем!" Пожалуй, ни один факультет не собирал на своих вечерах столько поколений студентов сразу. Здесь принимали участие те студенты, которые сейчас учатся в университете - это театр миниатюр "Кафтам"(читай справа - налево!). Хоть и образован театр недавно, но сразу завоевал расположение зрителей. Это комик-театр "Колизей" с участием тех, которые недавно закончили университет, ну и конечно - настоящие профессионалы - выпускники восьмидесятых годов.

Программа прошла более чем успешно. В зале не было свободных мест. Не удивительно, ведь желающих попасть на этот концерт было больше, чем мог вместить зал.

Мастерство студентов матфака в проведении дней факультета растет и отшлифовывается с каждым годом. И, несмотря на то, что приходят новые поколения студентов, старшие курсы передают свое искусство проведения дней матфака по "наследству". Каждые новые дни нашего факультета проходят интереснее, чем предыдущие. Нам остается только ждать дней математического факультета следующего года - таких же замечательных, содержательных, с полной мерой юмора, словом, - настоящего праздника интеллектуалов!

***Эмилия СЕНАТОРСКАЯ,***
***студентка матфака,***
***председатель***
***оргкомитета ДМФ.***

# ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ СЕСІІ

Шмат хто з нашых студэнтаў, атрымаўшы станоўчыя адзнакі на зімовай экзаменацыйнай сесіі, ужо забыліся пра былыя хваляванні. Аднак некаторых і па сённяшні дзень не пакідае галаўны боль з-за нездавальняючых адзнак. Пытанне аб здачы зімняй экзаменацыйнай сесіі ў свой час абмяркоўвалася ў дэканатах, у сярэдзіне сакавіка яно стала прадметам грунтоўнай размовы на пасяджэнні рэктарата. Вось якія лічбы і факты прывёў у сваім выступленні прарэктар па навучальнай працы І.П. Мартынаў.

У мінулую зімовую экзаменацыйную сесію да здачы экзаменаў было дапушчана 4118 студэнтаў дзённага аддзялення, вытрымалі экзамены 3872. Агульная паспяховасць склала 84,7 працэнта, гэта вышэй, чым у мінулагоднюю зімовую сесію, калі паспяховасць складала 76,6 працэнта.

Сёлета самая высокая паспяховасць на аддзяленні МЭА - 96 працэнтаў і аддзяленні педагогікі і псіхалогіі пачатковага навучання - 95 працэнтаў. Добрая паспяховасць таксама на факультэце права і эканомікі (аддзяленне права) - 94 працэнта, замежных моваў 91,4. Самая нізкая - на інжынерна-тэхнічным факультэце - 59,3.

Узрасла ў гэтым годзе колькасць выдатнікаў: 790 супраць 654 летась. Менш студэнтаў атрымалі ў час сесіі нездавальняючыя адзнакі: сёлета двоечнікаў 634 супраць 1050 летась.

І.П. Мартынаў асобна спыніўся на паспяховасці першакурснікаў. Самая высокая - на першым курсе аддзялення псіхалогіі - 100 працэнтаў, такая ж лічба на аддзяленні МЭА, на факультэце гісторыі і культуры. Самыя нізкія паказчыкі паспяховасці ў першакурснікаў інжынерна-тэхнічнага факультэта 49,4 працэнта (на інжынерным аддзяленні ўвогуле 40,5 працэнта), на філалагічным - 54 працэнта, біялогіі і экалогіі - 62,7.

Па выніках зімовай сесіі адлічана больш як 60 чалавек. Большасць, праўда, па асабістаму жаданню, але нямала і за акадэмічную непаспяховасць. Не за гарамі, як кажуць, летняя сесія. Мабыць, яе вынікі будуць больш паспяховымі, бо жорсткія ўмовы атрымання стыпендыі патрабуюць лепшых адзнак.

*С. ІВАНОВА.*



## БУДЗЕ БОЛЬШ ПАДРУЧНІКАЎ

Праблема наяўнасці падручнікаў для сярэдняй і вышэйшай школы ў апошні час ставіцца даволі востра, на тое маецца шмат прычын, аднак з цягам часу яна вырашаецца больш-менш станоўча. Вярнуўшыся з Мінску, прафесар Чарапіца В.М. член дзяржаўнай экспертнай камісіі пры Кабінеце Міністраў рэспублікі па гуманітарна-грамадазнаўчых праблемах, на пытанні нашага карэспандэнта адказаў наступнае:

- Разглядалася магчымасць выдання да наступнага навучальнага года школьных падручнікаў па геаграфіі, беларускай мове і літаратуры, па ўсеагульнай гісторыі і падручніка для пачаткоўцаў "Наш край", а таксама падручніка для вышэйшай школы па паліталогіі і інш. На стадыі экспертызы школьны падручнік па гісторыі Беларусі. Пасля некаторай дапрацоўкі аўтарамі ўсе яны будуць прыняты да друку выдавецтвамі.

# НА ЗЛОМЕ ЧАСУ

***Дацэнта кафедры беларускай літаратуры Мікалая Уладзіміравіча Мікуліча, які зараз вучыцца ў Мінску, у дактарантуры інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук рэспублікі, ведаюць студэнты і навукоўцы не толькі як педагога. Некалькі гадоў запар ён узначальваў універсітэцкае літаратурнае аб'яднанне "Наднёманскія галасы", дапамог многім пачынаючым паэтам і празаікам раскрыць свой творчы талент. Пры гэтым плённа працаваў і сам. Не так даўно сябры і калегі віншавалі Мікалая Уладзіміравіча з выданнем новай кнігі.***

Кузьма Чорны пісаў: "Чалавек - гэта цэлы свет". Свет непаўторны і цікавы, тым больш, калі гаворка ідзе пра асоб неардынарных, надзеленых талентам творцы. Іх жыццёвы вопыт, погляд на мінулае і будучыню падштурхоўваюць да роздуму, глыбокага аналізу рэчаіснасці. Размовам з такімі людзьмі - вядомымі пісьменнікамі, літаратуразнаўцамі, фалькларыстамі - прысвечана новая кніга кандыдата філалагічных навук Міколы Мікуліча "На зломе часу", якая ўбачыла свет у выдавецтве "Навука і тэхніка" напрыканцы мінулага года.

Рэдкі жанр кнігі - інтэрв'ю - дазволіў аўтару данесці да чытача жывы голас майстроў нашай літаратуры - Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Сяргея Грахоўскага, Івана Шамякіна, Ніла Гілевіча, Васіля Зуёнка... Суразмоўцы М. Мікуліча разважаюць пра "чалавека і грамадска-сацыяльныя пераўтварэнні", "захаванне духоўна-маральных набыткаў народа", праблемы нацыянальнага літаратурна-мастацкага развіцця, яго дасягненні і страты.

Нягледзячы на вялікую колькасць закранутых праблем, можна вылучыць два асноўныя моманты гаворак. М. Мікуліч мэтанакіравана цікавіцца жыццём былой Заходняй Беларусі, тагачасным літаратурна-творчым працэсам, лёсам пісьменнікаў. Успаміны мастакоў слова пра Рыгора Шырму, Ігната Дварчаніна, Язэпа Драздовіча, Валянціна Таўлая, Наталлю Арсенневу, Алеся Салагуба, Піліпа Пестрака з'яўляюцца жывой старонкай гісторыі нацыянальнай культуры.

Адным з цэнтральных момантаў гутарак стала творчасць народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, праз прызму якой пісьменнікі ацэньваюць свае набыткі і страты ў літаратуры. У кнізе акрэсліваецца праблема ўплыву Янкі Купалы на творчы лёс заходнебеларускіх паэтаў, да вырашэння якой імкнецца аўтар. Асоба вялікага песняра ва ўспамінах яго сучаснікаў і калег па пяру з'яўляецца ўвасабленнем жыццёвай мудрасці і духоўнай прыгажосці чалавека.

Каштоўнасць сабранага М.Мікулічам матэрыялу не выклікае сумнення. Але героі кнігі ўяўляюць цікавасць для чытача перш за ўсё як пісьменнікі, якія дасканала валодаюць словам, тым больш, што іменна так і прадстаўляе іх аўтар у сваіх лаканічных нататках. Сярод іншых варта вылучыць гутаркі з Нілам Гілевічам, Васілём Зуёнкам і Іванам Шамякіным, у якіх падымаюцца праблемы літаратурнай творчасці. Суразмоўцы аўтара кнігі выказваюць свае думкі пра мінулае і будучыню беларускай літаратуры, перспектывы яе развіцця і дзень сённяшні, вельмі складаны і супярэчлівы, калі над таленавітым чалавекам навісае пагроза ператварэння ў "маральную пачвару". Пісьменнікі чытаюць і аналізуюць творы, якія, на іх думку, заслугоўваюць увагі /М. Танк, В.Зуёнак і інш./, дзеляцца сакрэтамі свайго майстэрства, разважаючы адносна тэматыкі і жанравых асаблівасцей твораў і г.д.

Несумненна, найбольшай увагі заслугоўвае раздзел, прысвечаны паэтычнаму слову Максіма Танка, да якога ў аўтара даўняя прыхільнасць і ўвага. "Глыбока прачулы аўтарскі лірызм і філасофія прытчы, традыцыйна-напеўны, "сабраны" верш і парадаксальнасць асацыятыўна-метафарычнага мыслення, раскалыханасць верлібра - шырыня мастацка-творчага дыяпазону паэта ўражвае". - піша М. Мікуліч. Аўтар кнігі знаёміць чытача з самабытнай мастацка-філасофскай тэорыяй пісьменніка, раскрывае асаблівасці яго творчага шляху, падмацоўвае свае думкі разважаннямі самога М. Танка. Раздзел вылучаецца не толькі зместам, падкрэслена глыбокім, важкім, але і будовай: непасрэдны дыялог з паэтам змешчаны ў літаратурна-крытычную "рамку", служыць яе неабходным элементам, удалай ілюстрацыяй.

Кожны з дзесяці раздзелаў кнігі "На зломе часу" мае на мэце дакладна і ў той жа час арыгінальна перадаць характар і ўнутраны свет героя. Гэтаму, акрамя ўсяго, садзейнічаюць іх трапныя назвы, а таксама ўдала падабраныя эпіграфы з твораў саміх пісьменнікаў, што дапамагае акрэсліць тэму будучай размовы.

Думаецца, знаёмства з новай кнігай Міколы Мікуліча будзе цікавым і карысным для чытача - незалежна ад яго ўзросту і профілю працоўнай дзейнасці.

*ІНЭСА БАЎТРЭЛЬ,*
*аспірантка інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН Беларусі.*



***Запрашаюць арнітолагі***

# А ЧАМУ Б І НЕ...

Чацвёрты год кожны чацвер збіраюцца на біяфаку універсітэта натуралісты - людзі, якія ведаюць, паважаюць родную беларускую прыроду і дбаюць аб ёй. Сабраўшыся пасля чарговых суботніх ці нядзельных вылазак у лес, кожны апавядае пра ўбачанае, пра свае лясныя прыгоды ці гісторыі, "прачытаныя" па слядах на снезе, пра рэдкіх птушак, сустрэчы з якімі здараюцца не кожны год. Знаўцы дзеляцца сваім вопытам: як рас-



пазнаць падобныя віды птушак, як назіраць за імі, як фатаграфаваць і дзе яшчэ ў ваколіцах горада ёсць цікавыя для натуралістаў мясціны.

Звычайна на семінары збіраюцца студэнты розных факультэтаў, юныя натуралісты, гараджане - людзі розных прафесій і ўзросту, якія цікавяцца прыродай.

Гутаркі суправаджаюцца дэманстрацыяй відэаматэрыялаў аб жывёльным свеце, праглядам ілюстрацый. Тут жа можна даведацца і пра экскурсіі, якія плануюцца ў бліжайшыя выхадныя ці святочныя дні.

Ледзь толькі каляндар нагадаў нам пра сакавік, пра вясну ( а яе пачатак абдаў зімовым холадам), і вось ужо ўдзельнікі нашага семінара дзеляцца раднаснымі навінамі аб звычках лясных птушак: некага здзівілі першыя "вясельныя" песні попаўзняў, нехта пачуў трэлі вялікіх стракатых дзятлаў.

Птушкам на нашых семінарах удзяляецца асабліва шмат увагі. Пасля матылёў яны складаюць, напэўна, самы шматлікі і прывабны ансамбль у жывёльным свеце. У Беларусі іх зараз налічваецца 302 віда.

Слухачы нашых арніталагічных семінараў у свой час склалі касцяк Заходне-Беларускага Таварыства аховы птушак, пад эгідай якога зараз у заходніх абласцях ажыццяўляецца два міжнародныя праекты. Працы у гэтым напрамку, як кажуць, непачаты край. Таму запрашаю калег, студэнтаў з ўсіх факультэтаў на нашы "вячоркі". Тут вы шмат новага і цікавага



даведаецеся, раскажаце пра свае назіранні. Убачанае вамі не застанецца ў вашым сямейным архі-



ве ў выглядзе фотаздымкаў ці, можа, радкамі, занатаванымі ў запісной кніжцы, а то і проста малюнкам успамінаў. Яно стане набыткам іншых аматараў прыроды. Ды і вы ўбачыце жывёльны свет яшчэ больш шырока і глыбока, падмацуеце вашы веды і назіранні навуковымі высновамі. А галоўнае, усе мы, разам, зможам больш карысна зрабіць для захавання і памнажэння жывёльнага свету, для аздараўлення прыроды роднага краю.

Чакаем новае папаўненне аднадумцаў, аматараў жывой прыроды, вопытных і пачынаючых арнітолагаў кожны чацвер, у 17 гадзін, на біяфаку, у аудыторыі 138.

*А. ВІНЧЭЎСКІ,*
*выкладчык кафедры батанікі і заалогіі, прэзідэнт Заходне-Беларускага таварыства аховы птушак.*

*Фотаздымкі С. ЧАРАПІЦЫ.*



# Новая зорка на эстрадным небасхіле

У адзін з сакавіцкіх вечароў у музычнай гасцёўні Палаца культуры тэкстыльшчыкаў яна ўпершыню засвяцілася ўсёй сваёй прыгажосцю і самабытнай непаўторнасцю, даўшы першы свой больш чым гадзінны сольны канцэрт. Да гэтага дзявочы вакальна-інструментальны ансамбль не аднойчы ўпрыгожваў сваім удзелам студэнцкія вечары ва універсітэце. Пабывалі дзяўчаты ў Польшчы, прымалі ўдзел у рэспубліканскім фестывалі "Песню бярыце з сабою", выступалі ў Мінску на фестывалі маладзёжнай моды "Міла-96", іх здымала мясцовае і рэспубліканскае тэлебачанне. Праграма ў музычнай гасцёўні была ўсё ж самая змястоўная і прадстаўнічая. У ёй прагучалі шлягеры айчыннай эстрады, вядомыя творы замежных аўтараў, вытанчана-ўзнёслыя інструментальныя кампазіцыі таленавітага беларускага аранжыроўшчыка Уладзіміра Ткачэнкі. Ад напеўнай лірычнай песні "Жураўлі на Палессе ляцяць" да віртуознай фантазіі на тэмы легендарных "Бітлз", - на цэлы спектр музычных плыняў "замахнуўся" дзявочы гурт.

Нягледзячы на маладосць, ансамбль "Капрыз" зрабіў у той вечар заяўку на сваю сталасць і прафесіяналізм, адчуў упэўненасць у сваіх сілах, паспытаў радасць творчасці пасля працяглых рэпетыцый, спрэчак, роздуму, спробаў...

Сэрцы гледачоў пакарыла абаяльная Алена Стэльмах. Ад першай да апошняй песні на сцэне яна давала адчуванне натуральнасці, узнёсласці, радасці, лёгкасці, хоць усім добра вядома, якое велізарнае фізічнае, эмацыянальнае напружанне адчувае артыст перад залай. Алена - не толькі спявачка, але і таленавітая артыстка. Мне падалося, што менавіта яе імідж як найлепш дапасуе да ансамбля, імя якому "Капрыз".

У дзявочым ансамблі - адзіны мужчына: Аляксандр Аўсейчык, выпускнік фізічнага факультэта універсітэта, ён жа імпазантны саліст на сцэне, і ў той вечар парадаваў гледачоў добрай манерай выканання, прыемным голасам. Некалі ён вучыў дзяўчат асвойваць не зусім традыцыйныя для жанчын інструменты - ударныя, бас-гітару.

Прайшоў час, змяніўся склад ансамбля, яго рэпертуар. Нарадзіўся "Капрыз", якому наканаваны, мабыць, больш доўгі творчы шлях і, абавязкова, наперадзе чакае творчы ўзлёт, вядомасць.

У той сакавіцкі вечар іх твары і постаці здаваліся таямнічымі і ўзнёслымі ў промнях светавых эфектаў, але, мяркую, будзе яшчэ і "зорны" час ансамбля, калі не ў сціплай музычнай гасцёўні, а на вялікай сцэне зазязюць іх вочы, прасвятлеюць твары...

Яны ігралі, спявалі і ўпотай паглядалі ў залу. Яны шукалі Яе прызнання. Па яе рухах, хоць і ў паўцемры, яны адчувалі, ці ўсё добра на сцэне, ці задаволена Яна. А Раіса Леанідаўна Левіна сапраўды хвалявалася, кожнай клетачкай сваёй істоты перажываючы тое, што рабілася на сцэне. Нават тады, калі ў зале запалілася святло і яе віншавалі з выдатнай прэм'ерай ансамбля, хваляванне не пакідала яе. Бо не шкадуючы сіл і часу, стварала яна гэты ансамбль у тым абліччы, якое ён набыў зараз. Яна выпеставала мару аб ім, з яе ўдзелам і пад яе кіраўніцтвам мара набыла пэўны абрыс. Вось ён - яе "Капрыз", яе гонар і радасць...

Расказ пра дзявочы ансамбль універсітэта будзе няпоўным, калі паіменна не назваць удзельніц. Калі зноў запросіць вас на свой канцэрт "Капрыз", ведайце, для вас іграць і спяваць будуць студэнткі аддзялення мастацтваў: Таццяна Бараноўская (ударныя інструменты), Таццяна Фралова (бас-гітара), Іна Глебік, Наталля Чарнега (клавішныя інструменты), Сняжана Бернацкая (флейта), Наталля Пашчанка (саксафон-альт), Наталля Ярац (саксафон-тэнар), Юлія Лучына (гітара, саксафон-альт), Наталля Скабкарова (саксафон-тэнар, клавішныя), Алена Мацкевіч, Алена Сапілкіна (трамбоны), Наталля В'яліцына, Таццяна Пракопава (трубы), салісткі - Алена Стэльмах і Наталля Клімовіч, а таксама Аляксандр Аўсейчык.

На свой чарговы канцэрт "Капрыз" запрашаў універсітэцкую моладзь, выкладчыкаў і супрацоўнікаў 1 красавіка.

*С. МУРЫНА.*

---

**Да 100-годдзя сучасных Алімпійскіх Гульняў**

# Шлях да Алімпа

*Як вядома, зараз уся сусветная спартыўная грамадскасць вядзе падрыхтоўку да 100-годдзя сучаснага алімпійскага руху. А як жа ўзніклі сучасныя Алімпійскія Гульні? Хто іх прыдумаў? Некалькі слоў аб тым, хто падарыў чалавецтву сучасныя Алімпійскія Гульні.*

1 студзеня 1863 года ў Парыжы, у доме № 20 па вуліцы Ундзіна нарадзілася дзіця, якое шчаслівыя бацькі нараклі П'ерам. Прадбачылі вялікую будучыню, гадалі аб кар'еры бізнесмена або палітыка. Але хто мог тады ведаць, што нарадзіўся геній, якому суджана было адрадзіць і зноў падарыць чалавецтву такое цудоўнае свята здароўя, міру і дружбы, як Алімпійскія Гульні.

Яшчэ ў дзяцінстве П'еру папалася кніга вершаў Піндара. Кубертэн заўважыў, што ўсе 45 од былі прысвечаны пераможцам Алімпійскіх гульняў, якія праводзіліся шмат стагоддзяў назад на зямлі Старажытнай Грэцыі (Элады). Рамантыка тых далёкіх спартыўных свят на зары чалавечай цывілізацыі настолькі захапіла П'ера, што з гадамі перарасла у дзёрзкую мару - адрадзіць іх.

Але спачатку хлопчык стаў актыўна займацца фізічнымі практыкаваннямі, умацоўваючы сілу духу і мышцаў. Адначасова шмат чытаў аб Гульнях, вывучаў архіўныя дакументы.

Падрос, паступіў на філасофскі факультэт Сарбоны. Шмат часу праводзіў у бібліятэках і музеях, вывучаў антычнасць і міфалогію. А ў вольны ад вучобы час працягваў займацца верхавой яздой, грэбляй, боксам, фехтаваннем.

Скончыўшы універсітэт, ён асабіста адправіўся на зямлю старажытнай Алімпіі. Вярнуўшыся дадому, з натхненнем пачаў расказваць сябрам аб убачаным і пачутым. "А што, калі б нам, цяпер жывучым, арганізаваць такія святы? - пытаўся ён. І ад мары перайшоў да справы.

Вясной 1893 года Кубертэн адправіўся ў Міністэрства асветы Францыі, пераконваючы, што адраджэнне Гульняў падыме аўтарытэт Францыі, што гэта справа гонару кожнага француза і яго, міністра, асабіста. Урэшце рэшт міністр пагадзіўся з довадамі П'ера і дазволіў правядзенне на тэрыторыі краіны Сусветнага кангрэсу па адраджэнню Алімпійскіх Гульняў.

П'ер дэ Кубертэн неадкладна разаслаў пісьмы-запрашэнні ў спартыўныя арганізацыі розных краін свету. Адгукнуліся ЗША, Англія, Расія, усяго 12 краін.

У суботу 16 чэрвеня 1894 года актавая зала Сарбоны была перапоўнена. Сабралася амаль 2 тысячы чалавек. Ідэю адраджэння Алімпійскіх Гульняў падтрымалі ўсе. Заслухаўшы даклад Кубертэна і азнаёміўшыся з распрацаванымі ім арганізацыйнымі асновамі алімпійскага руху, кангрэс 23 чэрвеня 1894 года зацвердзіў Алімпійскую Хартыю. Згодна яе, Алімпійскія Гульні праводзяцца раз у чатыры гады. Яны аб'ядноўваюць спартсменаў абсалютнай большасці краін. Не дапускаецца ніякіх ушчамленняў па расавых, рэлігійных і палітычных матывах. Прынцыповым было сцвярджэнне, што гонар правядзення Алімпійскіх Гульняў даецца не краіне, а гораду. Але грамадзяне краіны, дзе праводзяцца Гульні, маюць права выступаць пад нацыянальным сцягам. Так пачыналася...

На кангрэсе было вырашана правесці першыя Алімпійскія Гульні сучаснасці ў Грэцыі, дзе яны калісьці нарадзіліся, а адзначаючы выключныя заслугі П'ера дэ Кубертэна, другія Гульні арганізаваць у 1900 годзе ў Парыжы.

Першым прэзідэнтам Міжнароднага Алімпійскага Камітэта быў выбраны грэк Дэмэтрыус Вікелас. Кубертэн быў зацверджаны генеральным сакратаром, а праз два гады прэзідэнтам.

15 красавіка 1896 года, напярэдадні нацыянальнага свята Грэцыі - Дня незалежнасці - кароль Георг І аб'явіў Гульні першай Алімпіяды новага цыкла адкрытымі. Дадам, што ў склад МАК на першых Алімпійскіх Гульнях у Афінах ад Расіі ўваходзіў рускі генерал Аляксей Дзмітрыевіч Буткоўскі.

*У. ЯГОРЫЧАЎ,*
*кандыдат гістарычных навук.*

# ГЛАВНОЕ - ОБАЯТЕЛЬНАЯ ВНЕШНОСТЬ

Каждый год красочные рекламы на улицах города, объявления в газетах зазывают юных красавиц поучаствовать в очередном, ставшем уже традиционным, конкурсе на звание Королевы красоты года. Университетскими девушками мы можем гордиться: не однажды они завоевывали самые престижные награды. Но, к сожалению, нет опыта подготовки участниц к таким шоу, секреты победительниц - тайна и загадка.

Дорогие красавицы, претендентки на титул Королевы, прочтите эту страничку, где любезно делится своими впечатлениями участница Гран-финала конкурса 1994 года Екатерина Тимашова, студентка 3 курса факультета истории и культуры.

- Участие в конкурсе - это большая смелость, поэтому многие девушки не решаются на участие. Нужно ли принимать участие в таком шоу и почему?

*- Бояться подобных испытаний не стоит. А расчитывать на успех можно лишь в том случае, если задолго до конкурса особое внимание обратить на осанку, походку, мимику, умение красиво двигаться в танце. И главное - иметь обаятельную внешность.*

*Шоу - это интересная вечеринка, на которой можно выиграть приз. А к поражению нужно отнестись философски.*

*Лично мне участие в конкурсе прибавило уверенности в себе, позволило лучше узнать закулисную жизнь шоу, пересмотреть свой образ жизни, отношение к питанию, к занятиям спортом.*

- Какие виды спорта Вам нравятся?

*- Люблю гимнастику. Хочу хорошо играть в теннис. Мечтаю прыгнуть с парашютом.*

- Как отнеслись к Вашей победе друзья, знакомые? Помогло ли это при сдаче экзаменационной сессии?

*- Тепло поздравил декан факультета, преподаватели, друзья. А что касается сессии - я полагаюсь на свои знания. Но я не против того, чтобы преподаватель все-таки обращал внимание на внешность.*

- Многие девушки после успешного выступления находят своего героя или герой находит свою принцессу, и меняется личная жизнь королевы красоты. Как у Вас обстоят дела с поклонниками?

*- Мне нравится в мужчинах доброта, уважение, ум, мужественность, снисходительность. К сожалению, тяжело найти такого человека...*

*Беседовал*
***В. РУДЕНИК.***

# КРАСИВЫ ЛИ БЫЛИ ДРЕВНИЕ?..

Женская красота... Что это такое? Как определить для себя тот идеал, к которому следовало бы стремиться женщине? Казалось бы, решение найдено: в конце XIX - начале XX века спорщики прибегли к помощи судей-членов жюри, собранных из наиболее компетентных специалистов, доверив им оценивать прелести той или иной красавицы по бальной системе. По девушке-победительнице и можно было судить об эталоне женской красоты, а скорее - о вкусах, пристрастиях и даже традициях того или иного времени, той или иной страны.

Понятие красоты отнюдь не являлось чем-то стабильным, данным раз и навсегда. Что нам смогут сказать уцелевшие мифы, легенды, предания, произведения искусства? А представления о внешности были более чем различны. Одни народы считали красивым лишь полностью татуированное тело, другие подпиливали передние зубы, третьи - добровольно обрубали фаланги пальцев, протыкали мочки ушей, носовую перегородку, губы, даже кожу на шее для подвески украшений. Одна из народностей Юго-Восточной Азии до сих пор определяет красоту женщины по длине шеи: прекрасная половина вынуждена с младенчества надевать на шею кольца, чтобы удлинить ее за счет раздвижения позвонков. В Китае женщины калечили ноги, стягивая ступни тугими бинтами, чтобы они всю жизнь оставались маленького размера.

При упоминании о древнегреческих красавицах почему-то воображение рисует мраморные статуи женщин с необъятными бедрами, массивной фигурой и неопределенной талией.

Идеальным у древних греков считался образ богини красоты Афродиты: "Она стоит так, что тело ее выгнуто плавно и музыкально. Как будто медленная волна прошла по ее талии, по ее бедру и ее ноге, прошла и оставила свой изгиб в ее плечах, в ее груди, в приоткрытых губах и в кудрях ее головы..."

Под влиянием религиозных догм в средние века внимание к телесному облику уменьшается. Тело упрятывается в роскошные длинные одежды, а высшей степенью восхищения становится высокое положение в обществе. Естественная красота отступает на задний план, становится лишь внешней оболочкой, вмещающей божественный дух. Повсеместной была инквизиция женской красоты. Тысячи прекрасных девушек были сожжены на кострах, так как инквизиторы видели в них "дьяволиц", призванных толкать человека на путь греха.

Прелесть средневековых красавиц - в хрупком изящном теле, в невообразимой узости бедер и еще большей узости покатых плеч, подчеркивающих единство и стройность силуэта.

В XVI веке вместо тонких, подвижных форм торжествуют могучие, цветущие тела с широкими бедрами, с роскошной полнотой шеи и плеч, без дразнящей эротики и кокетства, - вот они, героини полотен Тициана.

В XVII, "золотом", веке взоры ценителей женской красоты обратились к чувственной плоти. Правильные черты лица абсолютно не ценятся, так же как и важная торжественная осанка.

Первый турнир на звание королевы красоты состоялся в сентябре 1888 года в Бельгии, в курортном местечке Спа. По правилам турнира 350 участниц должны были оставаться неизвестными для широкой публики. Девушки жили в отдельном доме и даже на просмотры доставлялись в закрытых экипажах. Наконец из 20-ти финалисток жюри отдало предпочтение 18-летней креолке Берте Сукаре из Гваделупы, которая и получила приз в 5 тыс. франков.

Начало XX века вносит разнообразие в понятие женской красоты. Стали модны короткие стрижки, тонкие и плоскогрудые фигуры, без подчеркивающей талии и округлых бедер. Юбки тоже стали короче. Женщины начали усиленно заниматься физическими упражнениями, несмотря на критику мужчин, придерживающихся старых взглядов. На смену миниатюрной внешности приходят высокие и гибкие женские фигуры. Ну а конкурсы красоты все прочнее входят в жизнь. Организаторами вводится новый критерий красоты - вес. Так сложилось, что эталоном на международных конкурсах красоты принято считать такое соотношение в сантиметрах бюста, талии и бедер: 90-60-90, рост от 168 до 183, размер одежды 42-44. Такие формы имеют самые высокооплачиваемые манекенщицы мира. Например, Клаудия Шифер в 21 год имела следующие пропорции: рост 181 см, 92-62-92; а Синди Кроуфорд (25 лет): 177 см, 86-58-86.

*По материалам*
*"Энциклопедии для женщин".*



* * *

Кстати, уже объявлен набор девушек на очередной конкурс "Гродненская красавица - 96". Право участвовать остается за вами. Взвесьте свои возможности - и вперед! Кто знает, может быть, именно вы соответствуете идеалу современной женщины.



# УЧЕБА. КРАСОТА. ЗДОРОВЬЕ. ЧТО ВАЖНЕЕ?

Ответы на вопросы, предложенные Виктором Руденикoм студенткам 1 и 2 курсов математического факультета и факультета иностранных языков, помогают понять, как прекрасная половина относится к учебе, красоте, здоровью.

**28 процентов** опрошенных девушек хотели бы заниматься регулярно и занимаются физическими упражнениями, которые, в первую очередь, улучшают внешний облик;

**28 процентов** девушек считают, что физические упражнения важны для здоровья;

для **44 процентов** важно и здоровье, и красота.

А чему студентки отдают предпочтение?

**50 процентов** считают, что получение фундаментальных знаний важнее улучшения здоровья и сохранения привлекательного внешнего облика.

Для **20 процентов** девушек главное - хорошо выглядеть.

И знания, и красота одинаково необходимы для **30 процентов** опрошенных.

**И, уважаемые преподаватели, следует принять к сведению: 88 процентов опрошенных студенток лучше и быстрее усваивают преподаваемый предмет, если преподаватель отлично выглядит.**

# СЛАБЫЙ ПОЛ В БОРЬБЕ ЗА РЕКОРДЫ

24 сентября 1984 г. в Чикаго Дельфин Кра вышла замуж и прильнула к устам избранника. Этот поцелуй длился 17 дней и 10 с половиной часов. В тот же день, но в городе Ньюкасалапон-Тайн, некто Джон Макферсон за восемь часов перецеловал на площадке 4444 женщины, потратив на каждую в среднем 6,48 секунды.

Самой маленькой голландской лилипуткой была Полин Майтерс. В 19 лет она умерла от воспаления легких с сердцем, ослабленным от употребления алкоголя. При росте 59 см. она весила от 3,4 до 4 кг.

Легка, как пушинка, - такой была мексиканка Лючия Зарате, которая в 17 лет весила 2,125 кг. А в 1977 г. в издательство Гиннесса поступило сообщение о смерти 83-летней женщины (США), чей вес равнялся всего 15 кг.

Самой тяжелой женщиной считается американка Перси Перл Вашингтон, имеющая вес 399 кг, ей удалось побить рекорд (385,5 кг), который принадлежал негритянке из Босто и удерживался 82 года.

*Материалы страницы подготовили: **Наталья Ружко**, студентка 1 курса матфака и **Ольга Лука**, студентка 2 курса факультета иностранных языков.*

